Whiteruthenian News Paper "The Fatherland" Authorized by EUCOM Hq. Civil Affairs Division 27. July 1949, Nr.UNDP 225. Circulation 3500 copies. Administration: (13b) Rosenheim, Pionier-Kaserne, Whiteruthenian, DP Camp. Responsible Publisher: Wladimir Bortnik. Printed by Georg Jakob, München 8, Pütrichstraße 3a.

БАЦЬКАЎШЧЫНА

WHITERUTHENIAN NEWS PAPER "THE FATHERLAND" Цана 30 н. фэн., для заграніцы — 50 н. ф.

№ 2 (62) 25 САКАВІКА, 1950 г. Год выданьня 4.

1918 - 25 САКАВіКА - 1950

Што ґод - бліжэй да мэты

Трыццаць два гады таму, 25 сакавіка 1918 г., Рада Беларускае Народнае Рэспублікі ў сваёй Трэцяй Устаўной Грамаце абвесьціла поўную незалежнасьць Беларусі. **„Цяпер мы, Рада Беларускае Народнае Рэспублікі,** — пісала ў гэным гістарычным дакумэньце — **скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнае залежнасьці, якое гвалтам накінулі расейскія цары на наш вольны й незалежны край. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай.“** Гэтымі словамі тады была падведзеная падрахавальная рыса над усёй папярэдняй мінуўшчынай нашага краю і адначасна становка вызначалася гістарычна-канечнае наступнае й далейшае разьвіцьцё яго. А за гэтымі словамі стаяла воля самога народу. Бо Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, свабодна й дэмакратычна абраная на Першым Усебеларускім Кангрэсе 18—30 сьнежня 1917 г., каля дзьвюх тысячаў дэлегатаў якога паходзілі таксама з вольных і дэмакратычных выбараў, праведзеных сярод усіх частак, групаў цэлага народу, тым самым прамаўляла голасам гэтага народу. І гэты голас быў учуты і ўшанаваны тады далёка ў сьвеце, дарма што сьвет гэны сам быў яшчэ схоплены сутаргамі першай у гісторыі сусьветнай вайны. Як сьветчаць архіўныя дакумэнты, каля пятнаццацёх гаспадарстваў прызнала было незалежнасьць Беларускае Народнае Рэспублікі. І гэта былі ня толькі так званыя „малыя“ ці „Новыя“ дзяржавы, што самі сталіся незалежнымі бадай адначасна з нашай БНР (як Чэхія, Польшча, Фінляндыя, Летува, Лацьвія, Эстонія, Грузія, Украіна), але й »вялікія“ старыя традыцыйныя валадарствы, такія як сама Ангельшчына, Францыя, Задзіночныя Штаты Амэрыкі, Нямеччына, Аўстрыя, Турэччына. Да таго-ж яны ў большыні сваёй прызнавалі незалежную БНР ня толькі »дэфакто“, але й »дэ-юрэ“.

Гэткія былі першыя ўпэўненыя крокі новага жыцьця нашага краю й народу. І хоць абставіны усеагульнае стомленасьці сусьветнай вайной не далі тады магчымасьці да трывалага замацаваньня гэтых крокаў, а парожданыя гэнымі абставінамі цёмныя сілы, жыруючы на тэй стомленасьці, ізноў залілі наш край — не далося й ім спыніць далейшага разьвіцьця, мусілі й яны шукаць для яго формаў, у якіх яно хоць-бы сабе й толькі фармальна, але ўсё-ж гістарычна працягвалася й нат паступала наперад. Так, самі Маскоўскія бальшавікі, злыя духі гэных цёмных сілаў, ужо на пачатку 1919 г. мусілі пацьвердзіць ідэю незалежнасьці нашага краю, надаючы тваранай на ягоным прасторы сваёй Беларускай Савецкай Рэспублікі фармальную годнасьць незалежнага гаспадарства. І тое змаганьне, якое мы мусілі весьці ўвесь час, каб утрымаць гэтую годнасьць толькі фармальнай, вынішчаючы цэлыя міліёны людзей хоць-бы толькі падазраваных у намерах ці магчымасьцях прычыніцца да ператварэньня небясьпечнай фармальнасьці ў фактычную рэальнасьць — толькі яшчэ мацней нацьвярджае гістарычную канечнасьць і няўмірушчасьць народнай волі да стварэньня Незалежнага Беларускага Валадарства. Дык кажны крок такога змаганьня, якімі-б балючымі ахвярамі ён не здабываўся, якім-бы трыумфам не здаваўся ён засьлепленаму крываў ворагу — на самой рэчы, у гістарычнай пэрспэктывае можна разглядаць толькі як крок наперад па шляху да тэй мэты, якая ўпярщыню была выразна назначаная Радай Беларускай Народнай Рэспублікі ў ейным Вялікім Акце 25 сакавіка 1918 г.

Гады ішлі, і гісторыя, руку якое злосьнікі ўвесь час стараліся скіраваць на затрыманьне далейшага поступу нашага народу ды, здавалася, мелі ў гэтым такія вялікія ўдачы — на самой рэчы толькі падштурхвала далей наперад рух нашай народнай ідэі. Тыя самыя бальшавікі, што адразу-ж па першай сусьветнай вайне мусілі ўсё-ткі пацьвердзіць прынцып незалежнасьці Беларусі, напрыканцы нядаўнай другой сусьветнай вайны былі змушаныя... Гэтым самым Незалежная Беларусь заняла нарэшце сваё месца ў сьвеце суверэнных ныя на далейшы і ўжо зусім блізкі да завяршальнага крок. Яны мусілі ўвесьці наш край, як зусім незалежную фармальна дзяржаўную адзінку, у сусьветную арганізацыю суверэнных народаў — у Арганізацыю Задзіночаных Нацыяў як сталы й раўнапраўны сябра. Той факт, што на дадзеным адрэзку часу яна прадстаўленая там у існасьці чужым ём ува ўсіх дачыненьнях, навет біялёгічна, бальшавіцкім савецкім урадам — ня мае тут ніякага прынцыповага й канчальнага значэньня: урады й навет дзяржаўныя сыстэмы народаў ніколі ня былі й ня будуць рэчай зусім нязьменнай, а пагатоў — урады й сыстэмы, накіданыя і ўтрымваныя тэрорам і гвалтам. Сусьветнае-ж прызнаньне народу як суверэннага між суверэнных застанецца назаўсёды, пакуль гэтыя народы будуць на сьвеце.

А тымчасам, хоць памалу, а зьмяняецца, разьвіваючыся ў спрыяльным для нашага народу кірунку, і агульнае сусьветнае палажэньне. Бальшавізм, які быў і ёсьць найзьлейшым ворагам нашага й некаторых іншых, паняволеных ім народаў, усё больш і больш раскрывае свой запраўдны твар лютага ворага усіх воллюбных нацыяў, усяго чалавецтва. І ўсё больш і больш людзей пазнае гэты твар, а разам з тым і сярод усё шырэйшых колаў расьце ўсьведамленьне канечнасьці станоўкага бою з гэтым сусьветным ворагам — таго бою, у якім здабыў-бы сабе запраўдную волю й незалежнасьць і наш народ. Дык гэтак кажны крок такога антыбальшавіцкага самаўсьведамленьня людзей і народаў наблізкае дасягненьне мэты й народу нашага.

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі, якая абвесьціла яе незалежнай 25 сакавіка 1918 г., сама такасама не загінула ў хвалях гісторыі. Страціўшы шмат і шмат сваіх сяброў, адзін час, у моц абставінаў змушаная да захоўваньня сваё істоты ў вясобах блізу што толькі сваіх Прэзыдэнтаў — Крэчэўскага, Захаркі — яна пакрысе аджыла зноў апошнімі гадамі і зноў разбудоўшая штораз многалюднейшую і вытрывалейшую варту Ідэі 25 Сакавіка. Пільныя й нясупынныя крокі гэтае варты ў краёх выгнаньня, адважныя й мужныя крокі ейныя ў пушчах паняволенае Бацькаўшчыны — гэта цьвёрдая й нязломная хада народу да ягонае мэты, гэта поступ самой гісторыі, тэмп якога гэта ўжо добра відаць — узмацняецца й будзе ўзмацняцца шточасу, набліжаючы вялікую часіну поўнага ўжыцьцяўленьня народнага ідэалу, выказанага 25 Сакавіка 32 гады таму.

Гэтак, што год — бліжэй да мэты, што час, няўхільней перамога нашае праўды! **М. Цітовіч.**

Прывітаньне Прэзыдэнта

Дарагія Сёстры, Браты
Харобрыя Змагары,
цярплівыя мучанікі вязьніц, концлягераў,
шматпакуны Беларускі Народзе,
гаротныя Эмігранты!

Вітаю Вас усіх з 32-мі ўгодкамі прагалошаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі і жадаю Вам усім сілы, гарту, вытрываласьці.

Ведаю як нязносна цяжка Вам гэтыя надлюдзкія цярпеньні!

32 гады заця̂тага змаганьня зь лютым ворагам за волю нанесла нам цяжкія крывавыя раны...

Раны гэтыя для нас моцна балючыя! Адны з нас цярпяць іхнюю боль фізычна, другія духова. Але як ня ёсьць цяжкімі гэтыя раны, для беларускага народу ў цэласьці, ня ёсьць яны сьмяротнымі... Беларускі народ, абдораны Вялікай Ласкай Боскіх Законаў, нязможнае нутраное сілы жывучасьці, пераканвае нас, што няшчасьце гэтае над сабой мы перапрываем.

Дарагія Сёстры, Браты! Ня сотні і не дзясяткі ўжо год аддзяляюць нас ад мамэнту, калі нашыя мукі духовы, болі фізычныя зьменяцца на пяшчотна-кволыя пачуцьці радасьці — Вясельля.

Абходзім таму і гэтыя 32-я ўгодкі нашага вялікага Нацыянальнага Сьвята, як дзень нашае перамогі над бальшавіцкай тыраніяй, бо і на гэты раз, хоць і на адзін год, але прыблізіліся мы да таго дня, калі яго будзем сьвяткаваць на сваіх вольных палетках, як вольныя грамадзяне!

Верце моцна, што Найвялікшы зь Вялікіх дзён крочыць нам насустрач шырокімі крокамі.

Дружнай грамадой, шчыльнымі радамі ідзем яму далей насустрач і мы!

Жыве Беларусь у змаганьні!

Жыве БНР.

Нью-Ерк Мікола Абрамчык



Першы габінэт Ураду БНР (20. 2. 23, VII 1918 г.). Сядзяць зьлева направа: **А. Бурбіс** — маскоўскі консул, **І. Серада** — міністар гаспадаркі, **Я. Варонка** — прэм'ер-міністар і міністар замежных справаў, **В. Захарка** — міністар фінансаў; стаяць зьлева направа: **А. Смоліч** — міністар асьветы, **П. Крэчэўскі** — міністар дзяржаўнага кантролю, палк. **К. Езавітаў** — віцэ-прэм'ер і вайсковы міністар, **А. Аўсянік** — міністар нутраных справаў, **Л. Заяц** — дзяржаўны сакратар.

Прэзыдэнт БНР у Чыкага

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

28-га студзеня 1950 г. беларуская калёнія ў Чыкага на чале з былым прэм'ерам першага Ураду БНР сп. Я. Варонка, былым міністрам Ураду БНР сп. Я. Чарапуком і палк. М. Дзямідавым спаткала ў Чыкага прыбыўшага сюды на запросіны беларусаў Сп. Прэзыдэнта БНР інж. М. Абрамчыка. Назаўтрае ў прысуетнасьці высокага гасьця адбылася нарада актыву чыкагскае калёніі беларусаў. На нарадзе абмяркоўваліся чарговыя заданьні беларускага вызвольнага руху. 30-га ўсе ўдзельнікі нарады былі запрошаныя на ўрачыстыя абед до сакратара Беларускае Нацыянальнае Рады штату Ільліноіс сп. Лабача.

5-га лютага а 9. 45 раніцы Сп. Прэзыдэнт праз чыкагскую радыёстанцыю „Вэдс“, якая мае да 250.000 слухачоў — эмігрантаў з былое Расейскае імпэрыі, зьвярнуўся з прывітаньнем і заклікам да беларусаў ЗША. Прамова Сп. Прэзыдэнта сваім зьместам суровае крытыкі бальшавіцкае тыраніі ў Беларусі й патрыятычнага звароту да сваіх суродзічаў, што досыць часта знаходзяцца пад уплывам расейска-бальшавіцкае прапаганды, зьявілася запраўдную бомбаю. З боку прамаскоўскіх элемэнтаў старое эміграцыі да дырэктара радыёстанцыі пасыпаліся пратэсты й пагрозы за »паклёпы на Савецкі Саюз і камуністычную партыю“. Затое зь вялікай удзячнасьцю Сп. Прэзыдэнта віталі за ягоны выступ беларусы. Адзін старэнькі эмігрант з Кобрына, які прыехаў зь Беларусі 40 год таму назад, устаў хворы з ложка й зьявіўся да Сп. Прэзыдэнта.

Увечары таго-ж дня ў салі Ленарда ў чэсьць Сп. Прэзыдэнта чыкагскай калёніяй беларусаў было зладжана ўрачыстае прыняцьце-банкет. На прыняцьці прысутнічалі прадстаўнікі іншых паняволеных бальшавіцкай Масквой народаў. Шматлікія прамоўцы, вітаючы Сп. Прэзыдэнта, зычылі перамогі беларускага вызвольнага руху над маскоўска-бальшавіцкімі акупантамі Беларусі. Нават адзін зь лідэраў расейскіх работнікаў у Чыкага, які выпадкам трапіў на прыняцьце, у сваёй прамове заявіў:

»Сёньняшняя прамова Прэзыдэнта Абрамчыка ў радыё падымае аўтарытэт ня толькі беларускае калёніі ў Чыкага, але таксама й расейскае, якая ў вачох амэрыканцаў уважаецца найбольш скампраметаванай сваёй сьляпой прывязанасьцю да бальшавізму. Дагэтуль яшчэ ніхто не адважваўся кінуць бальшавіком такое бомбы. І таму гэты такі сьмелы выступ Сп. Прэзыдэнта бясумліву моцна падкуражыць і ўзварухне да антыбальшавіцкае працы ня толькі беларусаў, але й расейцаў і іншых“.

Навязваючы да цытаванае прамовы расейскага прадстаўніка, зусім ня дзіўна, што расейская прабальшавіцкая прэса ў ЗША узьнялася люты вой супроць выступленьня Сп. Прэзыдэнта. Гэтак нью-ёрскі **»Русскій Голос“** у сваім нумары ад 14-га лютага 1950 г. за ананімнымі подпісамі »П. І“ і **»Русскіе амеріканцы, Арго, Іллінойс“** зьмясціў аж два пратэстуючыя артыкулы („Ді-Пі зторгаются в русскій радіочас“ і »Мы протестуем“). У гэтых артыкулах найміты Крамля паводля інструкцыяў сваіх маскоўскіх хлебадаўцаў пішуць:

»Ен пачаў сваю прамову з таго, што Беларусь нібы знаходзілася пад няволяю розных дзяржаў, а цяпер знаходзіцца пад няволяю камуністых... Крыўдна было слухаць, як гэты »ды-півец“ нясла віў край і людзей, што выратавалі чалавецтва ад дзікага нацызму... Савецкі народ бараніў свой край, свой палітычны лад, як ніхто ніколі не бараніў свае бацькаўшчыны... Там, у Беларусі, без яго й яму падобных, маладое пакаленьне даволі добра збудавала сваё жыцьцё...“

Вось чаму »русскім амеріканцам“ не спадабалася „выступленьне ворага з „ды-пі“, які асьмеліўся паклёпнічаць на наш вялікі народ“, „супроць Савецкага Саюзу й усяго прагрэсыўнага“. Гэтыя артыкулы-пратэсты аж занадта гавораць самі за сябе, каб дадаваць да іх камэнтары.

Мы толькі зьдзіўлены, чаму гэтыя „савецкія патрыёты“ сядзяць далятуль у „капіталістычнай Амэрыцы“, а ня едуць у „маскоўскі сацыялістычны рай“, дзе „маладое пакаленьне даволі добра збудавала сваё жыцьцё“.

З прамовы Прэзыдэнта у радые

..Мінула ўжо шмат часу, як Вы пакінулі нашу зямельку. Пэўне-ж рэдка хто з Вас не абліваў яе сваімі горкімі сьлязьмі пры разьвітаньні-ад, езьдзе.

Вы ехалі шукаць долі-шчасьця, бо ў Беларусі было цесна, цяжка. А цесна, цяжка было ня з прычынаў ней к іх прыродных абставінаў, а з прычынаў гаспадараньня ў нас чужакоў, якія, заваяваўшы наш каліс вольны край, пасадзілі ў нас сваіх паноў, вынішчылі нашу інтэлігенцыю, а народ наш, давёўшы да крайняе цэмры, падпарадкавалі свайму вызыску.

Вы ўцяклі ад гэнае гора-улады!

Але-ж ня мог гэтак зрабіць увесь беларускі народ Застаўшыся дома, у зьняволеным краю, ён таксама намагаўся, каб неяк палепшыць свой лёс.

Навукай жыцьця й горкае практыкі собскага карку беларускі народ прыйшоў, урэшце, да высноўку, што **ён ніколі ня зможа быць шчасьлівым, покуль не здабудзе сабе вольнай і незалежнай дзяржавы, покуль ня возьме ўлады ў свае собскія рукі.**

Беларускія вучоныя, што выйшлі з народу й ня выракліся свайго народу, давялі навукова, што ўся тая мана нашых праціўнікаў аб беднасьці Беларусі й нейкай „мужыцкасьці“ нашае нацыі, сьведама была прыдумана імі дзеля ўтрыманьня Беларусі пад сваім панаваньнем, Легэнды аб прыроднай убогасьці Беларусі былі разбітыя нашымі вучонымі выкрыцьцём розных невычарпальных падземных і надземных у нас багацьцяў, якімі нас так шчодра абдарыла прырода.

Беларускія навукоўцы разьбілі й выдумкі аб нyздольнасьці нашага народу да дзяржаўнага самакіраваньня. бо давялі цэламу сьвету фактамі гістарычнае праўды, што беларускі народ у працягу амаль 1000 гадоў, ня толькі што меў сваю собскую дзяржаву, але меў магутную дзяржаву, з найвышэйшай культурай і справядлівейшым сацыяльным ладам спасярод сваіх суседзяў...

Нашы няпрошаныя „апякуны“, убачыўшы прабуджэньне вызвольных імкненьняў беларускага народу, нястрыманы паток ягонае творчае сілы й палітычнае сьведамасьці, пачалі нам суліць розныя „аўтаноміі“, каб хоць у гэткі спосаб утрымаць надалей Беларусь пад сваім панаваньнем

Але беларускі народ, пазнаўшы цану ўсялякім „апекам“, рашуча й бескампрамісова павёў змаганьне за незалежнасьць. У 1917 г. на Усенародным Зьезьдзе ў Менску ён прагаласіў сваю Бацькаўшчыну Вольнай Рэспублікай, уклаўшы для яе законы заходняга дэмакратычнага ладу, людзкасьці й сацыяльнай справядлівасьці.

Зайздросныя й нягодныя нашыя суседзі, прывыкшыя карыстаць зь Беларусі, напалі на нашу маладую Рэспубліку з двух бакоў і падзялілі яе міжсобку. Шыркі цывілізаваны сьвет мала тады яшчэ ведаў пра беларускі народ, як такі, чаму й ня была нам дадзена памога, як то была дадзена для іншых народаў.

У Беларусі зноў запанаваў прыгон, няволя эканамічная, тэрор палітычны. Лепшыя сыны беларускага народу замыкаліся ў турмы, Бярэзу-Картускую — пад Польшчай, дзясяткамі тысячаў расстрэльваліся бальшавікамі ў Беларусі савецкай. **Аж 2.800.000 беларускага народу вывезена на пэўную гібель у розныя канцэнтрацыйныя лягеры сьцюдзёнае Сібіры.**

Але нат і такі тэрор ня стрымаў беларускага вызвольнага руху. Ідэя Незалежнасьці Беларусі сталася сьвятым ідэалам беларускага народу, і мучанікі за гэты ідэал штодзень ішлі ўміраць, каб уваскрэсла й жыла Беларусь. Распачаўшы змаганьне з расейскімі царамі, беларускі народ змагаўся далей з акупантам бальшавіцкім, польскім, зь нямецка-гітлераўскімі наезьнікамі, а цяпер гэтак-жа заўзята змагаецца зь вярнуўшымся нанова акупантам бальшавіцкім...

Але гэтае законнае змаганьне беларускага народу за свае людзкія правы, ахвяры, якія ён нясе ў гэтым змаганьні, вымагаюць і ад Вас, дарагія суродзічы, ня толькі спачуцьця, але й помачы.

Бальшавіцкія ўлады, загарадзіўшыся ад сьвету жалезнай заслонай, пазбавіўшы такім чынам і Вас кантакту зь Бацькаўсьсю, ашукваюць многіх з Вас баламуцтвам аб нейкім нібы „шчасьлівым“ жыцьці савецкіх народаў. Іхная прэса, накручаныя дыскі, радыё аб радасьцях і вясёласьці ў Беларусі ня ёсьць голас беларускага народу, гэта голас, гэта песьні ўпрывеліяваных апрычнікаў нялюдзкага сталінскага рэжыму. **Голос-жа беларускага народу — гэта цяжкі стогн, кроў, сьлёзы, мальбы да Бога й да ўсяго культурнага сьвету аб помачы-ратунку...**

Я лійыў тут сваім сьвятым абавязкам падаць Вам праўдзівы голас паднявольнае Беларусі. Хацеў, разам з гэтым, і перасьцерагчы тых многіх, якія пасярэдняю сваёю маральнаю й матэрыяльнаю падтрымкаю дапамагаюць тыранам беларускага народу, ня ведаючы што робяць.

Мы верым, што наступіць дзень упадку й бальшавіцкае тыраніі. Зьнікне жалезная заслона, і Вы зможаце адведаць Вашых родных у Вольнай, Незалежнай Беларусі. І як-жаж бы я хацеў, каб тады там, у Беларусі, нікога, аніводнага з Вас ня мучыла сумленьне, гледзячы ў вочы ўсім застаўшымся жывым; а перад тысячамі зьлеглых у магілу ад рукі жорсткага акупанта, перад тымі памерлымі за волю Боларусі, на сваёй душы каб ніхто з Вас ня меў граху. Дзеля таго я й заклікаю Вас усіх, усіх дарагія суродзічы, да супрацоўніцтва із праўдзівымі прадстаўнікамі беларускага народу, якім пашчасьціла знайсьціся нат ужо часткава й сярод Вас тут. Сярод іх Вы знойдзеце нямала сваіх суседзяў, сваякоў, якія Вам раскажуць аб тым нялюдзкім рэжыме, ад якога яны ўцяклі й чаму ўцяклі.

Зь імі разам Вы зможаце шмат прынесьці карысьці свайму народу. Бог Вас за гэта шчыра нагародзіць, а Вашыя добрыя ўчынкі запішуцца на балонкі гісторыі Беларусі, як учынкі добрых і дастойных сыноў Беларускага народу дзеля ўзяцца за праўду народу.

Хачу моцна верыць, што Вашыя чулыя беларускія сІрцы адгукнуцца на наш кліч поўным зразуменьнем нас.

Дык хай-жа жыве еднасьць усіх беларусаў у цэлым вольным сьвеце дзеля памогі сваім братом-змагаром у Беларусі!

Жыве Вольная Незалежная Беларуская Народная Рэспубліка!

Згінь тыраньня!

Міліянер Розэнфэльд
вялікі дабрадзей беларускага народу.

Амэрыканскі міліянэр із Санта Роса (штат Каліфорнія, ЗША) Розэнфэлд у сваім прадсьмяротным тэстамэнце пераказаў усе свае грошы на пабудову й абсталяваньне дзіцячага шпіталю ў Беларусі. Гэты рэдкі паводзін сваё патрыятычнасьці дабрадзейны чын нашага колішняга земляка глыбока ўсхваляваў беларускія сэрцы.

Па гэтыя грошы ўжо выцягвалі свае рукі „прадстаўнікі“ Беларусі з Масквы. Калі-б ім удалося іх атрымаць, то яны напэўна найшлі-б не на карысьць нешчасьлівых беларускіх дзяцей, а на разбудову бальшавіцкае прапаганды ў самой-жа Амэрыцы. На шчасьце справядлівы амэрыканскі суд, пазгледзіўшы гэтую справу, вынес пастанову аб тым, што, згодна тэстамэнту нябошчыка міліянэра, у сучасны момант няма такога кансуляту, які меў-бы права атрымаць грошы.

Грошы перададзеныя на перахаваньне ўладам Каліфарнійскага штату. Пастанова амэрыканскага суда дае гарантыю таго, што некалі гэты скарб-прэзэнт вялікага дабрадзэя нашага народу запраўднымі беларускім уладамі будзе ўжыты на прызначаную мэту.

Вечная памяць і удзячнасьць прыяцелю нашых дзяцей!

ными, не выкарыстоўваюцца цалкам усе магчымасьці разьвіцьця, а таксама зрываецца выкананьне пляну збору ураджаю збожжавых і тэхнічных культураў.

Нявольніцкая праца ў Саветах

Амэрыканская Фэдэрацыя Працы, якая нядаўна выступіла супроць карыстаньня нявольнай працай у СССР, 28-га лютага перадала ў УНО рапарт, у якім маюцца шматлікія дакуманты з доказамі існаваньня прымусовай працы ў Савецкім Саюзе.

Дакументы даводзяць, што нявольнікі МВД даюць дзяржаве палову лясных матар'ялаў, 10% хатняга судзьдзя, 40% хрому й 3/4 ўсёй прадукцыі золата.

Амэрыканская Фэдэрацыя Працы просіць, каб міжнародная Камісія зрабіла вывучэньне ўмоваў працы ў СССР.

Крытыка савецкай сельскай гаспадаркі

Лёндан (АП). Рада Міністраў СССР і Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі абвінавачваюць партыйныя органы й савецкія ўстановы паасобных раёнаў, асабліва Беларусі і раёну Цэнтральнай Расеі, — у „нябайнасьці арганізацыі сельскай гаспадаркі“. Калгасныя пляны не зьяўляюцца ў запраўднасьці рэаль-

РОЗНАЕ
„Лётаючыя талеркі“

Амэрыканская прэса ізноў шмат піша на тэму аб зьяўленьні ў Мэксыцы лётаючых талерак. Выказваюцца розныя прыпушчэньні адносна іх паходжаньня, а паміж іншым, што пілёты іншых плянэту наблюдаюцца да зямлі. Навет паважныя дасьедчыкі ў ЗША ня выключаюць магчымасьці, што такім чынам нечакана можам мець візыту „зь іншых плянэтаў“.

— **Папа Піус XII абвесьціў энцыкліку, у** якой заклікае да адмысловай малітвы ў пасьвыйную нядзелю 26. 3. 1950 за аднаўленьне ўрыцыянскіх звычаяў і згоду паміж народамі. Папа скардзіцца ў энцыкліцы на перасьлед касьцёлу й рэлігійнага жыцьця ва ўсходня-Эўрапейскіх краях.

— **Устрымалы масавы уезд у Бразылію ДП** зь нямецкіх лягераў. Цяпер будуць данушчацца толькі сваякі тых, хто ужо пераехаў і спецыялістыя.

ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАДЗЕІ

Веснавыя праменьні сакавіковага сонца г. г. паўплывалі й на міжнародна палітычны клімат. Заходні сьвет, выходзячы з дэмакратычных прыцыпаў, ня можа зачыніць дарогі да выяўленьня волі вольных грамадзянаў.

Дзякуючы гэтаму адбываецца сыстэматычнае прасяканьне камуністычных бацылаў у найбольш адказныя галіны жыцьця Заходу.

Сьветчыць аб гэтым **афэра Фукса ў Ангельшчыне, імкненьні Францускіх камуністых** скампраміатаваць дэмакратычны лад ды інш.

Аднак, камунісстычны стан уладаньня ўвесь час зьмяншаецца.

Паказалі гэта ангельскія выбары ў парлямант, дзе ня ўдалося правесці ніводнага камуністычнага кандыдата, паказвае гэта **Чыкагскі зьезд парты Уолэса,** які вымушаны на Бэльгіі адносна павароту караля Леанпольда. вет крыху „крытыкаваць“ сваіх апякуноў, а

На прадвесні г. г. выявілся дрэнь справа і ў самым камуністычным „раю“.

Правал „таварыша Губічэва“ на шпіёнстве і нефартуннае атрыманьне 15 гадоў зьняволеньня.

Новае выяўленьне „сыстэмы“ сьледзтва ў краінах „народнай дэмакратыі“, калі былы перакладчык Амэрыканскага пасольства ў Баўгарыі, Міхал Шыпкоў, пад прысягай расказаў аб 32-х гадзінным фізычначамаральным над сабой зьзеку у баўгарскім НКВД, якое ўрэшце атрымала патрэбнае яму „прызнаньне“ у няіснуючых злачынствах.

Усё гэта, аднак, ня вельмі прайме „бацьку“ усіх народаў. Абвяшчаецца новая цацка сваім дзеткам, а менавіта — праводзіцца **рэвалёрызацыя рубля** (навялічэньне вартасьці яго — раней быў ягоны курс 5 руб. 30 кап. за 1 даляр, цяпер — 4 рублі) і адначасна зьніжэньне цэнаў ад 10 да 30%. На першы пагляд гэта можа паказацца вялікім асягненьнем. Аднак, фантастычна высокі курс рубля азначае, што сатэлікія краі Расеі будуць плаціць ёй больш, а атрымоўвац-жа сабе менш.

Зьніжэньне цэнаў датычыць перадусім недаступных працоўнаму люду прамысловых вырабаў, як самаходы, халадзільнікі, піяніна. Цэны-ж на вырабы першай патрэбы ў дачыненьні да заробку ў 10 разоў большыя, як у Амэрыцы.

Узмацняецца наступ на Азію ды заходнія Савецкія сателіты і далей на захад.

Свае станевішча да гэтай пагрозы апошнім часам вельмі ясна спрэцызаваў урад ЗША, праз вусны свайго Статссакратара Дін Эчысона.

Дін Эчысон у сваёй прамове, ў Бэркэлей, 16. 3. 1950 г. сканкрэтызаваў становішча ЗША да найбольш вострых праблемаў сусьветнай палітыкі. Эчысон асьветчыў, што ЗША ёсьць, былі й будуць гатовыя да ўдзелу ў перамовах урэгуляваньня спаваў міру, **аднак міру не за ўсялякую цану.**

У дачыненьні да Саветаў Эчысон вельмі выразна зазначыў, што ўсялякая слоўная дэкламацыя Крамля аб імкненьні да міру павінна быць падмацаванае дзеяньнем, а дзеля таго ўвесь сьвет чакае ад Саветаў!

1. добрай волі ў дачыненьні да падпісаньня мірных мовай зь Нямеччынай, Аўстрыяй і Японіяй.

„Мы, кажа Эчысон, ня хочам рабіць зь Нямеччыны, Японіі і Аўстрыі Савецкіх саталітаў. Нямеччына можа быць аб'едьнана толькі праз агульныя вольныя выбары пад міжнародным кантролем.“

2. Вываду вайсковых сілаў із сатэліцкіх краёх ды даньне магчымасчы правесьці ў гэтых краёх запраўды свабодныя выбары, кад там маглі быць створаныя ўрады, якія будуць выяўляць запраўдную волю народаў.

3. Прыступіць да запраўднага супрацоўніцтва ў УНО; пакінуць абструкцыю й байкот працы УНО.

4. Кантроль атамнай энэргіі камісіяй, якая ня будзе знаходзіцца пад кантролем ні Саветаў, ні ЗША.

5. Перастаць выкарыстоўваць розныя камуністычныя арганізацыі ў іншых краёх дзеля ўвядзеньня закалоту ў гэтых краёх.

6. Належна адносіцца да дыплеманычных прадстаўнікоў ЗША і ня лічыць іх праступнікамі, ды ня весьці супроць іх фальшывай прапаганды.

7. **Савецкія правадыры павінны пакінуць уводзіць у блуд свой народ** праз зласьлівую прапаганду супроць ЗША.

Паставіўшы гэтыя сем пунктаў, Дын Эчысон зацеміў, што ўсё цяпер залежыць ад добрай волі народаў, якія хочуць так як і ЗША міру, але міру не за ўсялякую цану.

Ня трэба паддавацца, аднак, ілюзіям, зацеміў Эчысон, што Савецкія правадыры выявяць запраўды добрую волю і пагодзяцца з намі, а дзеля гэтага ЗША разам з усімі народамі, што істотна імкуцца да міру, павінны быць моцнымі і станоўкімі.“

З чужое прэсы

„Беларускі вызвольны рух“

Украінская канадзкая газэта **„Українскі Работнік“** зьмясьціла ў сваім № 48 ад 9. 12. 1949 г. вялікі артыкул пад тытулам „Беларускі вызвольны рух“. Падаем з гэтага артыкулу найбольш характэрныя месцы:

„Незалежнасьць Беларусі ў форме Беларускае Народнае Рэспублікі была абвешчана 25-га Сакавіка 1918 году ў сталіцы Беларусі Менску... Маладая дзяржава не змагла ўтрымацца супроць сваіх спрадвечных ворагаў із захаду й з усходу... Згодна Рыскае ўмовы, Беларусь была падзелена між Польшчаю й Масквою. Урад Беларускае Народнае Рэспублікі апынуўся на выгнаньні...

Ад 1918 году нас аддзяляе амаль 32 гады. У **працягу гэтых 32-ох год беларускі народ ня склаў свае зброі. Ягоныя ахвяры** толькі да другое сусьветнае вайны дасягілі **каля 3-ох міліёнаў людзей забітых, загінуўшых і закаваных на савецкім выгнаньні, у польскіх турмах і на палёх бою.** Сёньня ў Беларусі існуе моцная партызанская армія, якая налічвае звыш 50.000 жаўнераў. Яна змагаецца з маскоўскім чырвоным фашызмам за незалежнасьць свае Бацькаўшчыны... Часы нацыянальнае нясьведамасьці ў Беларусі даўно ў мінуласьць. **Беларускі народ ужо ніколі не пагодзіцца із панаваньнем у Беларусі Масквы ці Варшавы...** З надыходам спрыяльнага мамэнту 20-ці міліённы народ бязумоўна здабудзе незалежнасьць...

Пасьляваенная беларуская эміграцыя паводля свайго характару ў большыні ёсьць палітычнай. Яна складаецца з усіх пластоў беларускага народу й расьцярушана па цэлым сьвеце. На эміграцыі, а часткава й на Бацькаўшчыне знаходзяцца Рада й Урад БНР, якія маюць мандат ад Першага Усебеларускага Кангрэсу з 1917 году. Урад БНР для дасягненьня свае мэты — вызваленьня Беларусі зпад маскоўскае няволі й аднаўленьня назалежнае Беларускае Рэспублікі — цесна супрацоўнічае з прадстаўніцтвамі ўсіх паняволеных бальшавікамі народаў, а галоўна з тымі, якія вызнаюць Беларусі права на незалежнасьць у яе этнаграфічных межах. Існуе толькі невялікая група, якую завуць „зарубежнікі“. Гэтая група працуе на карысьць Масквы й у супалцы зь ёю. Беларусы на эміграцыі сёньня аб, еднаныя вакол сваіх нацыянальных і палітычных арганізацыяў, што падтрымліваюць Урад БНР.“

Змаганьне не спыняецца.

У нумары за люты 1950 г. месячніку **„АБН Карэспандэнт“** успамінаецца аб памятным 25 Сакавіку 1918 году, які даў беларускаму народу так доўга чаканую, хоць такую нядоўгую, як там пішацца, незалежнасьць. Як кажа карэспандэнт, „хоць маладая Рэспубліка й была залітая бальшавіцкімі гордамі, ідэя незалежнае Бацькаўшчыны не памерла ў народзе. Ен пачаў цяжкое, няроўнае, ўпорыстае ходаньне супроць заходнпікаў, ходаньне, якое трывае аж да сяньня. Дзякуючы злучаным сілам апору паняволеных народаў, рэпрэзэнтаваных у АБН, гэтае змаганьне нават усьцяжмацнее. Прэс аЗаходнае Эўропы што раз часьцей успаміна аб **беларускай партызанцы пад Вільняй, Горадняй, Лідай, Менскам і Баранавічамі,** якая вядзе асабліва зацятае змаганьне з НКВД і ягонымі агентамі. Часамі гэтыя дробныя партызанскія аддзелы лучацца ў большыя адзінкі й на цэлыя тыдні займаюць гарады й мястэчкі, затрымліваюць цягнікі, вызваляюць вязьняў і г. д. Мясцовае жыхарства ў большасьці выпадкаў шчыра падтрымоўвае іх, дзе толькі мага.

„Беларусы ў Аўстраліі“

„Газэта Польска“, што выдаецца ў Торонто (Канада), ў нумары ад 25-га студзеня г. г. зьмяшчае невялічкую нататку свайго сыднейскага карэспандэнта аб жыцьці беларусаў у Аўстраліі. Газэта, між іншага, піша: „Беларусы, што дасталіся з Эўрапейскіх лягераў уцекачоў да Аўстраліі, не зважаючы на вялікую расьцярушанасьць, выказаліся моцнай нацыянальна-культурнай і рэлігійнай дзейнасьцю. Паўсталі ўжо зародкі арганізацыі, а таксама тримадзкія і харытатыўныя тавары́ствы“.

„Выступ па радыё Беларускага Прэзыдэнта“

Украінская газэта „Украінец — час“, што выходзіць у Парыжы, зьмясьціла ў сваім № 10 (176) ад 5. III. 1950 г. зацемку на тэму „Выступ па радыё Беларускага Прэзыдэнта“. У зацемцы падаецца, што „Прэзыдэнт Рады БНР на чужые сп. М. Абрамчык выступаў 5-га лютага па радыё ў Чыкаго (ЗША). У сваёй даўгой і запальнай прамове Прэзыдэнт войстра крытыкаваў Савецкі Саюз і пад канец зьвярнуўся із заклікам да тае часткі беларусаў у Амэрыцы, якія далі ашукаць сябе бальшавіцкай прапагандай, — адчыніць вочы, убачыць праўду й стаць у вабароне паняволенае сёньня Беларусі“.

У службе „Чорнага Ката"

Справа беларускае пызанкі набірае што раз большага разгалосьвеце. Адзін па адным, уцекачы з-за „лезнае заслоны" як свае, так і немцы прысяць нам цікавыя й па здрадзяныя весткі аб беларускіх партызанах — змагарох із зьненавіданым бальшавіцкім захопнікам, аб іхнай арганізацыі, працы й чынах.

Мы падаем нашым чытачом вынятки з успамінаў адналго нямецкага палоннага, якому выпадкам трапілася быць у шэрагах магутнае беларускае партызанскае арганізацыі „Чорны Кот".

Вярнуўшыся зь ецю дапамогаю да хаты, ён апісвае свае жыцьцё ў Саветах, уцекі ступль і свой побыт у беларускіх партызанскіх аддзелах на балонках нямецкае газэты „Зюддойчэ Цайтунг" (Кн. № 141—146, артыкул „Мае ўцёкі зь Сібіры"). Камэнтары да ўспамінаў аўтара думаем непатрэбныя.

— „Аднае памятнае раніцы, — піша ён, у маёй вандроўцы на поўдня бяз компасу й карты праз мазурскія бары я апынуўся вусім нечакана твар у твар із шасьцю незнаёмымі. Яны былі ўзброеныя ў не асабліва дапасаваныя ўніформы. Іхная ўзьнятая ўгару зброя рабіла каже супраціўленьне бязмэнтным... Двух узброеных узялі мяне паміж сябе і абшукалі мае кішэні. „Адвесьці" — сказаў камандзір. Чорная хустка пакрыла маю галаву й вочы, моцная вяроўка заціснула рукі. Мяне павялі"... Людзі, да якіх я далучыўся, належалі да „Чорнага Ката", беларускага партызанскага руху. Яны апынуліся ў мазурскіх лясох дзеля адмысловага заданьня: пакрываць шляхі, якімі ішла для іх зброя з Польшчы, а таксама пільнаваць цягнікі із бальшавіцкімі анспартамі.

Весткі аб сістэме суправаджальнага пэрсаналу й гатунку грузаў зараз-жа падаваліся па радые далей. Яцудоўна была зарганізаваная гэтая перадача паведамленьняў, я пазнаў колькі тыдняў пазьней, калі я стаўся сьведкам нападу беларускіх партызанаў на бальшавіцкі таварны цягнік, які вёз нямецкую жывёлу з Мэкленбургу ў Крым.

Людзі, належачыя да перадавых пастоў „Чорнага Ката", амаль усе бяз вынятку працавалі ў калхозах і сьцягваліся ў лясы толькі ў выпадках большае „акцыі". Малая-ж група, да якое я трапіў складалася з людзей прысланых у гэтыя лясы з Галоўнае Квартэры, якая іх ўтрымлівала й забясьпечвала ўсім патрэбным. Праз тры тыдні „шэф" паслаў мяне з двума людзьмі ў Галоўную Квартэру. Колькі дзён пазьней я стаў перад Вітушкай, усемагутным камандзірам „Чорнага Ката". І не ў цесным бункеры ў глухім лясным лягеры, а ў добра абсталяваным асабняку ўсё яшчэ прыгожае Вільні.

Спаўняючы свае абавязкі пасланца, я добра пазнаў жыцьцё „нелегальных" і мусіў грунтоўна зьмяніць свае погляды на іхную арганізацыю. Ужо адно ўяўленьне, што усе партызаны хаваюцца па найбольш глухіх кутках і дзеюць толькі ў вялікаў тайнасьці, — зусім не адказвала праўдзе. Бальшыня жыла жыцьцём спакойных грамадзян і працавалі, як усе Некаторыя зь іх займалі нават даволі адказныя становішчы ў Гарадзкіх Управах, Паліцыі, Вайсковых Штабах, а нават у МВД.

У гэтых дачыненьнях нічога не зьмянілася аж да сяньняшняга дня...



Абход 25-га сакавіка адным зь беларускіх партызанскіх аддзелаў у 1948 г.

Таемныя законы беларускае партызанкі нагадваюць сабой чорны крыж Сыцылійскае Мальты. Той, хто зрадзіць партызана МВД, ня можа жыць болей пэўным свайго жыцьця.

Жывучы сярод беларускіх партызанаў на працягу даўжэйшага часу", — працягвае аўтар успамінаў, — „я працаваў шмат тыдняў пры абслугоўваньні іхных радыёперадатачнікаў. Адзін з такіх найнавейшых апаратаў стаяў у маім утульным пакоі, дзе былі частымі гасьцьма ваколічныя беларускія сяляне. Адноўчы ўвечары, калі мы сядзелі ўсе разам каля радыёпрыймальніка, нехта пастукаў у мае дзьверы... Праз гадзіну, старыя сялянскія „дрбіны" везьлі мяне й колькі іншых сяброў у чорную ноч. За калгаснымі будынкамі да нас далучылася яшчэ восем „нелегальных". Фурман добра ведаў дарогу, і незадоўга мы спыніліся ў цёмнай лясной лагчыне.

Узброеныя ў аўтамат постаць вышла насустрэч нам з ценю калматае хвоі й сказала замест прывітаньня: „хутчэй, шэф чакае Вас ужо". Мы пайшлі за ім, спатыкаючыся аб карэньні на ледзь прыкметнай лясной сьцежцы. Нізкія галіны елак білі нас па твары. Мы вышлі на палянку. Група людзей параняла нас і навяла да камандзіра. Ен быў вельмі малады, і я пазнаў у ім бачанага колькі тыдняў назад ад'ютанта Вітушкі.

— „Слухайце", Ж сказаў ён, мы чакаем сяньня ўначы расейскага цягніка, які вязе жывёлу, пераважна кароваў з Мэкленбургу ў Крымж. У нас ужо ўсё гатовае. Цягнік мае быць праз дзьве гадзіны. Вам будзе сказана, што рабіць. Гэта ўсё!"

Мы моўчкі разьмяйся па мясцох. Я трапіў у аддзел, які меў сачыць падыход цягніка.

Мы ляжалі на халодным пяску насыпу і чакалі. Пачало віднець. На што раз сьвялейшым небе выразна выступілі сініе абрысы высокіх елак па той бок рэйкаў. Было Ходадна. „Рыхтуйцеся", — пачулі мы зянянаку голас зь цермы. І запраўды здалёку, пачуўся глухі гул... хутка бліснулі два цьмяныя вагенчыкі... Мы кінуліся на зямлю... Хутка цягнік параўняўся з намі, тады — мінуў. Навакол нішто не варушылася... І раптам — грымотны выбух! За ім густы лопат кулямёту...

Далёка напарадзе ўсьцяж стралялі. А тады — зрабілася зусім ціха. Толькі перапалоханая жывёла жаласна й глуха рыкала ў цёмных вагонах. Мы пайшлі да цягніка. Хутка дзьверы вагонаў былі выбітыя й пачалася праца. Я пабачыў маладую дзяўчыну ў кавалерыйскіх нагавіцах і ботах, якая перавязвала раненаму партызану руку.

Цёмныя густыя валасы падалі ён на твар. Раз па разе яна адкідала іх назад энэргічным рухам галавы. „Ці ня маеш ты перавязачнага бінту?" спытала яна мяне. Я пашукаў у кішэнях ўважна раскучвала бінт. „Ты новы ў нас, ці ты немец?" — спытала яна, калі ранены парні ідаў ёй тое, што яна прасіла. Дзяўчына тызан адыйшоў. Я кіўнуў галавой, і яна ўсьміхнулася поўнай зпазуменьня ўсьмешкай. Пазьней толькі я даведаўся, што гэта была Аляксандра. Ейнага бацьку расстралялі бальшавікі, і яна адна зь першых пайшла змагацца зь ягонымі забойцамі. Беларусь, які расказваў мне аб ёй, цьвердзіў, што яна нязвычайна адважная. Толькі раз бачыў ён яе плачучы, калі бальшавікі схапілі аднаго маладога студэнта, што разносіў лятучкі.... Відаць, яна любіла яго...

Н. Арсеньнева.

25 САКАВІК

Ен прыйдзе, гэты дзень!
Ен ня прыйсьці ня можа!
Ен прыйдзе
й загудзе вясновы буралом,
Пакрышыць, разьмяце,
Раскідае, зьніштожыць
Усё, што нам шляхі да хаты замяло!
Ці чуеце? Аб ім
Шасьціць быльнёг аселіц,
Пяюць вятры ў лазе,
і звоніць крыгаў лёд.
Ахвяраю крыві,
А Слова Стане Целам
І ўжо ніколі больш ня ўстане Чорны Год.
Няхай бярэмя він
Прыгнула нас, і крылы
Апалі,
й хлеб чужы нясмачны і важкі,
Няхай нас апавіў
Тугой агорклы вырай, —
Трывайма!
Ен ідзе —
Вялікі Сакавік!
Ідзе...
й пад ногі рунь
Яму кладзецца, таюць
Сьнягі, на паплавох зяленіцца трава...
Радзіма!
Беларусь!
Крывічына Сьвятая!
Багаславі нас жыць
і веру захаваць!

Антыбальшавіцкая дэманстрацыя ў Галіфаксе

У гор. Галіфаксе (Анголышчына) 11. 12. 1949 г. адбылася вялікая антыбальшавіцкая дэманстрацыя беларусаў, украінцаў і летувісаў. Дэманстранты із сваімі нацыянальнымі сьцягамі й плякатамі прайшлі праз цэлы горад. Першай ішла беларуская калёна з транспарантам „Зь верай у Бога вызвалім Беларусь ад камунізму". Па дэманстрацыі ў Вікторыя Галь адбыўся мітынг. На ім супроць бальшавіцкае тыраніі выступалі пралстаўнікі паняволеных Масквою народаў. Першым зь іх прамаўляў беларус Я. Запрудзік. У мітынгу бралі ўдзел і англічы, а англейская газэта „Католік Геральд" зьмясьціла аб гэтай дэманстрацыі й мітынгу справаздачу.

БНР у дакумэнтах

(Працяг Гл. № 1 (61)

Мэмарандум у Лігу Нацыяў

Лясы Беларусі страявыя і мачтавыя. Маецца многа дубовых пушч. Адна Белавежская пушча займае абшар ўзвыш 1000 кв. кілямэтраў, якую Польшча стараецца запрадаць супроць пратэсту беларускага народу, без яго згоды, Лёнданскаму Лясному Трэсту. Эксплёатацыя лясоў па данным 1913 г. давала для вывазу з Беларусі 46-мільёнаў пудоў лесу і лясных матарыялаў. Апрача таго вывозілася вырабаў дрэва:

Кавальскага вугля	3.11.000 пуд.
Запалок	1.022.000 пуд.
Паперы рознай	1.600.000 пуд.
Тэрпэтыны	393.000 пуд.

Вываз сельска-гаспадарчых прадуктаў уключна прадуктамі вырабаў з дрэва выносіў да 100-мільёнаў пудоў. Увозілася ў Беларусь

Пшонная мука	215.100 пуд	258.000 пуд.
Штучнага гною	315.700 пуд	1.196.00 пуд.
Суконных матэрыял.	208.000 пуд	645.000 пуд.
Папярва-бавальнян.	287.000 пуд	615.300 пуд.
Жалеза		2.845.000 пуд.

Цукар і камянны вугаль атрымліваўся з Украіны нафта і газа — з Каўказу.

Балоты, рэкі і вазёры

У балотах і нягоднай зямлі Беларусі ляжыць аграадны лік торфу, прырост якога, па вылічэньню інжынера Орнацкага, можа задаволіць шыроканаладжаную беларускую прамысловасьць.

Рэкі і вазёры, акрамя выгады і таннасьці трэнсіту, даюць вялізарны лік рыбы і бязьмежны запас белага вугаля для прамысловасьці электрафікацыі.

Прамысловасьць

Прамысловасьць на Беларусі знаходзілася ў пешапачатковым стане, аднак таргова-прамысловыя цэнтры — Вільня, Горадня, Беластк, Бранск, Менск, Смаленск, Пінск, Вялейка і інш. канкуравалі з прамысловасьцю агульнарсейскай. Усяго на Беларусі было каля 12.000 фабрык і заводаў. Самы большы лік фабрык прыпадае на прамысловасьць харчовых прадуктаў. (5500), хімічных — (3500), керамічных і мінэральных (800), апрацоўка жывёльных вырабаў — (700), тэкстыльных (200), дрэваабрабочых і запалачных (400), папяровых (150), мэталічных (80), бровараў (710), піваварных (84) і мёдаварных (38). Вартасьць вырабаў раўнялася 110 мільён. рублёў, пры 100 тыс. рабочых.

Падзел Беларусі

У сучасны момант Беларусь разарвана на пяць частак. У цэнтры камуністамі створана незалежная Савецкая Беларуская Рэспубліка з тэрыторыяй 113.115 кв. кл. насел 3.859.000 чал.

Анэксірав. Р. С. Ф. С. Р. 183.039 кв. кл. насел. 6.479.200 чал.

Анэксірав. Польшчай

па Рыжскай умове 101.990 кв. кл. насел. 4.458.700 чал.

прылучана да Літвы 5.433 кв. кл. насел. 231.000 чал.

прылучана да Латвіі 11.870 кв. кл. насел. 494.000 чал.

Агулам 415.453 кв. кл. насел. 15.521.900 чал.

Эксплаатацыя Беларусі

Польшча па Рыжскаму міру акупавала 101.990 кв. кілямэтраў беларускай тэрыторыі, з 4½ мільёнамі гэктараў аромай зямлі і 3. 124.679 кв. гэкт. лесу, у тым ліку красу і гордасьць усей Эўропы-Белавежскую пушчу.

Да Польшчы перайшлі галоўнейшыя таргова-прамысловыя цэнтры Заходняй Беларусі: Вільня, Горадня, Беласток, Берасьце, Пінск, Вілейка і інш. з 6417 фабрыкамі і заводамі, на вартасьць вырабаў да 60 мільёнаў рублёў.

Жалезнадарожныя вузлы — Берасьце, Беласток, Вільня, Чаромха, Горадня, Баранавічы, Пінск, Лунінец, а таксама і водныя шляхі — Нёман, Прыпяць, Дзьвіна, Піна, Буг, Нараў, Днепроўска-Бугскі і Аўгустоўскі каналы перайшлі ў рукі Польшчы.

Эксплёатацыя лесу, апрача даходаў у казну ад прадажы, дала мажлівасьць польскаму ўраду адбудаваць зруйнаваныя вайной мяйсцовасьці этнаграфічнай Польшчы.

Ападаткаваньне беларуская жыхарства — пазямельнае, падымнае, падушнае, страхавое (бяз выплаты страхоўкі), падаткі на жывёлу да сабак і кошак уключна, даюць вялізарныя прыбыткі у казну, так як стаўкі падаткаў перавышаюць некалькі разоў стаўкі падакаў даваенных.

Дарэмная рэквізыцыя быдла, коні і спажыўчых прадуктаў у жыхарства, кормяць польскую армію па мейсцах і даюць мажлівасьць лішкі вывозіць у Варшаву.

Польскія войскі налічваюць у сваіх радох ня менш 30—40 тысяч салдат беларускай нацыянальнасьці, разкіданых па некалькі чалавек па ўсёй тэрыторы этнаграфічнай Польшчы.

Прадстаўнікі польскіх сацыялістычных партый Недзялкоўскі, Жулаўскі, і Тугут, выходзячы з перадпасылак эканамічнай зацікаўленасьці Польшчы ў Беларусі, імкнуліся асьвятліць беларускае пытаньне ў Лёндане, Парыжы, Рыме і Жэнэве, як пытаньне эканамічнае, а не нацыянальнае.

З гэтым ня можа згадзіцца беларускі народ, бачачы ў эканамічнай зацікаўленасьці сваіх сеседзяў і залог свайго будучага незалежнага існаваньня.

Што Польшча дала Беларусі ў замен

Із паловы зруйнаваных сёлаў і вёсак Заходняй Беларусі да гэтай пары, пры данамозе дзяржавы не адбудавана ніводная. Вярнуўшаяся насяленне жыве ў зямлянках.

Лес эксплаатуецца і вывозіцца заграніцу і ў Польшчу, а на мяйсцох даецца толькі польскім ваенным асаднікам, але не беларускаму жыхарству.

Да I стулзэня 23 г. было пасаджана у Беларусі 8700 вайсковых асаднікаў і ў 23 г. разьмешчана 9000 сем'яў невайсковых.

Самаўрадаў няма, камандуюць назначаныя старасты і войты. Фактычная ўлада знаходзіцца ў жандараў і таемнай паліцыі.

Усе натуральныя павіннасьці выпаўняюцца мяйсцовым жыхарствам бязплатна.

Ніякіх выдаткаў на культурна-нацыянальныя, грамадзкія і іншыя не паліцэйскія патрэбы польская дзяржава не нясе. Нават сярэдняя й ніжэйшыя школы існуць на прыватныя грошы насельніцтва.

Із 400 беларускіх школ, існаваўшых у часе вайны, зачынена 380. Вучыцялі ў большасьці выпадкаў сядзяць у польскіх турмах за беларускую прапаганду.

Із 500 цэркваў пераброблена на касьцёлы і зачынена 305, У астаўшыхся цэкрвах права Божай службы і выпаўненьне хрысьціянскіх абрадаў даюць адпраўляць толькі тым сьвятарам, якія маюць права польскага жыхарства, а такіх сьвятароў, як верных польскай дзяржаве маецца — толькі восем.

Каапэратывы ўсе зачынены. Эканамічныя цэнтры зруйнаваныя.

За пяць гадоў панаваньня у Заходняй Беларусі польскай уладай зачынена 48 беларускіх газэт і журналаў: у сучасны мамэнт, з частымі канфіскацыямі выходзіць толькі адна газэта.

У турмах Польшчы і канцэнтрацыйных лягерох томіцца бяз суда і следзтва да 10 тысяч беларусаў.

Вывад

Зацікаўленьсьць Польшчы і Расеі ў Беларусі чыста эканамічная. Задоўжанасьць Польшчы у сучасны момант дасягае аграмадных размераў. Унутраны доўг раўняецца двум з паловай квадрыльёнам польскіх марак, а вонкавы поўтара мільярда залатых францускіх франкаў.

Цяжар свавй задоўжанасьці Польшча імкнецца пералажыць на анэксаваныя тэрыторыі Беларусі і Украіны з іх цьвёрдым бюджэтам — хлеба, лесу і лёну.

Расея разбурана камуністамі — ей неабходна адбудаваць сваё старое эканамічнае становішча за рахунак тых-жа акраін.

Ні ў безкантрольным рааськіданьню народных сродкаў Польшчы, ні хіжацкім рабунку Расеі, Беларусь удзелу не прыймала. Ніхто ня можа і ня мае права прымусіць Беларусь плаціць па чужых рахунках, бяз запытаньня і згоды Беларускага народу.

Прыймаючы пад увагу пазытыўную спэцыфічнасьць Беларусі ў тэрытарыяльным, эканамічным і нацыянальным адношаньні — беларускі народ на падставе сацыяльных перадпасылак усяго вышэйсказанага і выяўленя сваей волі на Усебеларускім Кангрэсе 17 сьнежня 1917 г. і пастановы Рады Рэспублікі 25 сакавіка 1918 г. патрабуе поўнай незалежнасьці Беларусі як ад Польшчы, так і ад Расеі.

Старшыня Рады
Беларускай Народнай Рэспублікі
П. Крэчэўскі

20. У. 1924 г.

(Замежная Беларусь", бал. 133—139)

Ад рэдакцыі. (Раздзелы: „Версальскі мір і Польшча", „Інквізыцыя", „Гістарычная справа" і „Спэцыфічнасьць Беларусі" з тэхнічных прычынаў у Мамарендум не увайшлі.

(Працяг будзе).

Зь Беларускага жыцьця

Беларусы сярод Альпаў

У прыгожым Мітэнвальдзе, сярод стромкіх гор. беларускае жыцьцё не затухае. Нашая нацыянальная група тут, пасьля перамяшчэньня сюды часткі польскага лягеру з Альтэнштату, яшчэ ўзмацавалася: сёй-той, дачуўшыся, што тут ёсьць Беларускі Нацыянальны Камітэт, свой сьвятар, група беларускае інтэлігенцыі, якая рупіцца аб сваіх людзях і наагул, ёсьць да каго пайсьці за парадай, ёсьць каму расказаць аб сваім горы бяз ніякага страху, бяз патрэбы ўкрываць што-небудзь, бо людзі-ж свае — а свой свайго зразумее найлепш і, чым можа, дахаможа — дык і падумаў сабе, ці ня лепш пайсьці да сваіх, чымся туляцца па чужых панадворках, жыць у рабскім страху на чужой ласцы. Бо як не кажы, свой ня чужы...

І так, хоць група і не імпануе лікам (нешта каля сотні душ) усё-ж супольнымі сіламі робіцца ўсё, на што толькі дазваляюць цяжкія сучасныя ўмовы жыцьця . Дня 13. 1. 1950 г. ладзілася супольнае спатканьне новага году з урачыстай службай Божай і супольнай вячэрай у залі ІМКА. Яшчэ раз удзельнікі спатканьня наяўна адчулі, як сільна мы павязаны з волі Бога Найвышэйшага вязямі крыві і зямлі нашае беларускай у адну вялікую народную сям'ю, якая, як і ўсякая сям'я, даражыць сваім багатым мінулым, мовай і звычаем, што перададзены ёй прадзедамі на зьберажэньне.

Чым чалавек бяднейшы, тым ён ахвярнейшы — гэтую праўду пацьвердзілі інашыя мітэнвальдцы, сабраўшы каля 70 н. м. на Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву. Не забываецца аб нашых землякох з Мітэнвальду і Цэнтраля БНК, якая праз сваіх зьвязных часта інтэрвэньюе ў Ч. У. С. М[...] Мюнхэн у справе ашурансаў. Сьпісак сем'[...]яў, што ня маюць дасюль ашурансаў пад[...]адзены ў Цэнтральны Беларускі Нацыя[...]нальны Камітэт дзеля далейшых захада[...]ў перад адпаведнымі дзейнікамі ў З[...] у ЗША.

П.

Беларускія радыёаўдыцыі з Рыму

Ад студзеня месяца сёлета Ватыканская радыёстанцыя ў Рыме кожнае пятніцы а гадз. 18.30 сярэднязўрапэйскага часу на ўхвалях 50,26; 41,21 і 31,10 мэтраў стала надае аўдыцыі ў беларускай мове.

3-ці Зьезд Беларусаў Бэльгіі

5-га лютага 1950 г. у гор Лювэне адбыўся 3-ці Зьезд Беларусаў Бельгіі. Абмеркаваўшы актуальныя праблемы жыцьця й працы беларускіх эмігрантаў у Бэльгіі, Зьезд выбраў новую Управу Саюзу Беларусаў Бэльгіі. У склад новае Управы СББ увайшлі: Я Жытко — старшыня, В. Рамук — заступнік старшыні, А. Арэшка — Б. Рагуля — сацыяльны рэфэрэнт і У. Набагэз — скарбнік.

Ліквідацыя лягеру Бакнанг

На пачатку сакавіка пачалася ліквідацыя беларускага лягеру Бакнанг. Частка беларусаў пераехала ў Эльванген — украінскі лягер, дзе была цёпла і вельмі прыхільна прынятая камандантам і адміністрацыяй лягеру, паселена асобна і ўважаецца, як асобная нацыянальная група. Рэшта беларусаў з Бакнангу перакідаецца ў жыдоўска-армянскі лягер у Бад-Канштат.

Угодкі нарадзінаў заснавальніка скаўтынгу

22 лютага г. г. у Розэнгайме дабылася скаўцкая ўрачыстасьць у чэсьць заснавальніка скаўтынгу Бэйдэн Паўэля. Гутарку аб скаўцкім шляху Б. П. меў скм. П. Манькоўскі. Наступна моладзь прасьпявала рад скаўцкіх народных і патрыятычных песьняў, а юначкі выступналі з дэклямацыямі вершаў.

Урачыстасьць закончылася гарачай развітальнай прамовай Галоўнага Кіраўніка В. Пануцэвіча ды скаўцкаў малітвай „Ноч ідзе".

Мітынг у Клэвэлэндзе

Праездам з Чыкага ў Нью-Ерк Сп. Прэзыдэнт затрымаўся ў гор. Клэвэлэндзе. Тут з нагоды прыезду прыбыцця мясцовымі беларусамі-эмігрантамі ў нядзелю 12-га лютага ў салі Украінскага Народнага Дом убыў арганізаваны мітынг. Перад мітынгам была вывешчана й пашырана ўлётка. На грудзёх удзельнікаў мітынгу красаваліся спэцыяльна падрыхтаваныя бел-чырвона-белыя сьцяжкі.

З напружанай увагаю беларусы й госьці-украінцы выслухалі вялікую прамову Сп. Прэзыдэнта аб змаганьні беларускага народу за сваю свабоду й незалежнасьць. Выступаўшыя з прывітаньнямі Прэзыдэнта украінцы дэкляраравалі й далей трываньне традыцыйнага беларуска-украінскага сяброўства ўзмаганьні за вызваленьне Беларусі й Украіны.

М. Беластоцкі

Ініцыятыўная група Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Аўстраліі

БІБ. У Брысзбоне (Аўстралія) наўстала ініцыятыўная група Задзінтчаньня Беларускіх Вэтэранаў.

У выдадзенай да беларускіх вэтэранаў у Аўстраліі адозве, між іншага зазначаецца: „Мы, вэтэраны Беларускіх Збройных Сілаў, што змагаліся за волю, дэмакратычную свабоду і незалежнасьць нашага народу, ня можам быць бяз сувязі між сабой. Мы мусім тварыць адну братэрскую сям'ю, мусім дапамагаць адзін аднаму ў біядзе й нядолі, мусім апекавацца нашымі калегамі, што страцілі здароўе ў барацьбе з ворагам, мусім апекавацца сем'ямі, а асабліва сіротамі паўшых калегаў; мусім таксама трымаць лучнасьць з усім грамадзянствам".

Ініцыятыўная група Беларускіх Вэтэранаў у Аўстраліі просіць усіх калегаў адгукнуцца на гэты заклік.

Беларуская рэпрэзэнтацыя на лягер Розэнгайм

У лягеры Піонір-Казэрнэ ў Розэнгайме адбыліся выбары ў мясцовы камітэт БНК на Піонір-Казэрнэ. На агульных колькасьць выбаршчыкаў 328 брала ўдзел у галасаваньні 259 асобаў, што дало 78,96%.

Новая брашура аб Беларусі

Згуртаваньне Беларусаў у Ангельшчыне вялікім тыражом выдана брашурку аб Беларусі паангельску. Брашурка мае назоў „Беларусь пад расейскай акупацыяй". Кожны беларус-эмігрант у краі ангелькае мовы мусіць мець гэтую брашурку й шырыць яе сярод чужынцаў.

ПРАЦА БЕЛАРУСКАЕ ІМКА-ІВКА

У зімовым пэрыядзе 1950 г. нашай ІМКА-ІВКА былі арганізаваныя дзьве экскурсіі, адна для вучняў гімназіі і Мюнхэн, дзе вучні зьведалі Заалягічны Батанічны паркі, ды іншыя годныя ўвагі мюнхэнскія асаблівасьці, другая для сяброў беларускае ІМКА-ІВКА ў вельмі цікавую й маляўнічую мясцовасьць Прын-Кімзее.

У пэрыядзе 1949 й 1950 г. адбылося некалькі міжнацыянальных канфэрэнцыяў ІМКА-ІВКА. У гэтых канфэрэнцыях бралі ўдзел і прадстаўнікі беларускае ІМКА-ІВКА з Розэнгайму. Міжнацыянальныя канфэрэнцыі ў Прыне далі магчы-масьць нашым прадстаўніком урайсьці ў бліжэйшы кантакт з прадстаўнікамі ня толькі нацыянальнасьцяў ДП, але й з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасьцяў Заходняе Эўропы. Такім імя беларуса й ягоная добрая слава разносіцца па сьвеце й умацняецца сярод усіх народаў сьвету.

Згодна распараджаньня Цэнтральных Сусьветнае ІМКА-ІВКА, гэтая арганізацыя будзе існаваць для высяленцаў і пасьля ліквідацыі ІРО. Кажная нацыянальнасьць будзе мець сваю ІМКА-ІВКА, што будзе апякавацца тымі ДП наагул высяленцамі, якія застаніцца па тых ці іншых прычынах у Нямеччыне. Дзеля таго, што часта беларусоў будзе прымушаная таксама жыць і далей у Нямеччыне, трэба імкнуцца, каб беларуская ІМКА-ІВКА існавала й у будучыні, пасьля ліквідацыі ІРО. Добра было-б, каб ужо цяпер было магчымым падлічыць тых людзей, якія тут застануцца й якія-б хацелі актыўна працаваць у ІМКА-ІВКА.

Беларуская ІМКА-ІВКА просіць зацікаўленых падаць свае адрасы ў беларускую ІМКА-ІВКА ў Розэнгайме. Лісты можна адрасаваць на Рэдакцыю „Бацькаўшчыны" з допісам „для ІМКА".

ЦАРКОЎНАЯ ХРО[...]

Адведзіны Розэнгайму Архіепіск[...]апам Сергіем

Перад сваёй эміграцыяй з Эўропы ў Аўстралію, Галава БАПЦ, Яго Высокапрэасьв[...]ства Архіепіскап Сергі[...] наведаў л[...]ягер Розэнгайм і Катэдраль[...]ную Царкву ў ім.

Уладыка пры[...]вёз і высьвяціў сьцяг для Жышэйшага Царк[...]оўнага Упраўленьня, а таксама ровіцкага Бр[...]ацтва, правёў паседжаньне Вы[...] Цэнтральна[...]га Упраўленьня Брацтва Жыровіцкае Б[...] Божае Маці.

Уладыка Сергій ад'ехаў шчыра вітаны цёпла праводжаны.

15 лютага г. г. адбылося паседжаньне Вышэйшага Царкоўнага Упраўленьня ў прысутнасьці Яго Высокапрэасьвяшчэнства Архіепіскапа Сергія, Яго прэасьвяшчэнства Епіскапа Васіля, сьвятара Войтанкі й сяброў Праўленьня ад вернікаў. На паседжаньні разглядалася справа арганізацыі прыходаў БАПЦ у розных краінах і аб павялічэньні ліку іерархаў.

Паводля атрымліваных лістоў высьняецца, што з усіх краін, дзе ёсьць беларусы, ідуць просьбы аб адчыненьні прыходаў БАПЦ.

Як паведамляюць з Аўстраліі, там, у Адэлаідзе адчынены прыход БАПЦ, які абслугоўвае сьвятар М. Шчурко. Таксама арганізаваны аддзел Брацтва Жыровіцкае Божае Маці і Вікарыяльнае Упраўленьне. Прадбачыцца адчыненьне яш[...]калькіх прыходаў.

З Англіі таксама пішуць аб залжэньні там прыходу БАПЦ. Таксама адчынены Аддзел Брацтва ЖБМ.

На Сьвята Грамніц — 15 лютага ў саслужэньні Яго Высокапрэасьвяшчэнства Архіепіскапа Сергія й. Я. Прэасьвяшчэнства Епіскапа Васіля быў высьвечаны ў дыяканы жыхар лягеру Розэнгайму сп. Савіцкі Калістрат, які пачаў Божыя Слушбы ў Царкве ў Розэнгайме.

Брацтва Жыровіцкае Божае Маці,

15 лютага ў Катэдральнай Царкве ў Розэнгайме ў Саслужэньні Архіяпіскапа Сергія й Епіскапа Васілія адбылося ўрачыстае высьвячэньне Сьцягу Брацтва Жыровіцкае Божае Маці, які падараваны Архіепіскапам Сергіем.

Таго-ж 15-га лютага выдадзены братчыкам і сёстрам Брацтва Жыровіцкае Божае Маці Пасьветчаньні ў ліку 86.

Зарганізаваны Аддзел Брацтва ЖБМ ў лягеры „Дiц", каля Франкфурта. Запісалася й атрымала пасьветчаньні 21 асоба.

Водгукі на аднаўленьне гіерархіі БАПЦ у чужынецкай прэсе

Апрача беларускае прэсы, шырокім рэхам прыязных нам народаў адгукнулася на аднаўленьне гіерархіі БАПЦ. За нястачаю месца падаем нашым чытачам толькі пералік ведамых нам газэтаў і часапісаў, якія зьмясьцілі аб гэтым прыязныя артыкулы сваіх карэспандэнтаў: украінскія газэты й часапісы — **„Українські Самосьційнык"** (Нямеччына, № 1 за студзень 1950 г., артыкул „Дружба двох народаў у дзень адраджэньня беларускае нацыянальнае царквы"), **„Украінэць-Час"** (Парыж, № 1—2 (167—168 ад 7. 1. 1950 — „Паўстала Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква"), **„Українськїй Голос"** (Канада, № 5 ад 1. 2. 1950 — „Паустала Беларуская Аўтакефальная Праваелаўная Царква". **„Ранок"** (Нямеччына, № 4 ад 11. 2. 1950 — „Аднаўленьне Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы на эміграцыі"), **„Царква і Нарід"** (Канада, № 1 за студзень 1950 г. — „Праваслаўныя беларусы й УАПЦарква"), **„Новы Шлях"** (Канада № 6 ад 25. 1. 1950 г. — „Аднаўленьне Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы на эміграцыі"), **„Українські Работнык"** (Канада, № 4 ад 27. 1. 1950 — „Аднаўленьне БАПЦарквы на эміграцыі", славацкая газэта **„Словэнска Обрана"** (ЗША, № 4 ад 12. 1. 1950 г. — „Вялікае сьвята беларускае эміграцыі"), газэта грузінскае царквы ў Нямеччыне **„Вера, Надзея, Любоў"),** № 1 ад 15 . 1. 1950 г. — „Хіратонія Беларускага Япіскапа Васілія"), **„АБН-Карэспандэнцы"** (Нямеччына № 1 за студзень 1950 г. — „Высьвячэньне Беларускага Япіскапа"), нымецкая газэта **„Розэнгаймэр Тагблатт")** № 39 ад 29. 12. 1949 г. — „Хіратонія ў Беларускай Царкве ў Розэнгайме") і інш.

Беларусы-каталікі без духоўнай апекі

Беларусы-каталікі Заходніх Зонаў Нямеччыны, з-за адсутнасьці сваёй духоўнай ерархіі, ня маюць сталай душпастырскай апекі. Стараньні а. Маскаліка ды аднаго латыскага каталіцкага сьвятара, што ведае беларускую мову, наведваць час-ад-часу тыя асяродкі, дзе ёсьць большая група каталікоў — ня ёсьць дастатковымі дзеля таго, каб задаволіць усе рэлігійныя патрэбы штодзённага жыцьця. Асабліва балюча гэта адчуваецца ў вялікія — гадавыя сьвяты.

Вось чаму ў гэтым годзе, тыя беларусы-каталікі, якія мелі шчасьце апынуцца ў Розэнгайме, зь вялікай удзячнасьцю успамінаюць энэргічнага **сьвятара а. Салаўя з Мітэнвальду,** які ня гледзячы на сваю абцяжанасьць па абслугоўваньню вернікаў колькіх нацыянальнасьцяў, не забыўся й пра сваіх суродзічаў ды наведаў іх ужо 2 разы.

Кажны прыезд а. Салаўя ўлівае шмат бадзёрасьці ў нашыя зьбянтэжаныя эміграцыйнымі клопатамі сэрцы, бо а. Салаўй сьвятар і прызваньня.

Шкада толькі, што гэты, такі адданы сьвятар, ня можа быць заўсёды разам з намі. Але мы верым, што й беларусы-каталікі ўсё-ж такі будуць мець сваю духоўную ерархію на эміграцыі, як яе ўжо маюць браты — праваслаўныя.

Каталіцкі Камітэт

БЕЛАРУСКІ СКАуТЫНГ

19-га лютага г. г. у Розэнгайме (Нямеччына) адбылася 4-я скаўцкая канфэрэнцыя ЗБСЧ. У канфэрэнцыі бралі ўдзел прадстаўнікі ад ангельскай і амэрыканскай зонаў Нямеччыны ў агульным ліку 22 асобы.

Із справаздачы галоўнага кіраўніка беларускага скаўтынгу В. Пануцэвіча і з дыскусіі па справаздачы вывілася, што **беларускі скаўтынг,** не ўважаючы на неспрыяльныя ўмовы і зьмену арганізацыйных формаў працы, **у мінулым годзе зрабіў значны поступ наперад.** Мінулы год быў пачаткам пашырэньня эміграцыі з Нямеччыны і Аўстрыі ў розныя краіны, а ў сувязі з гэтым і пачаткам ліквідацыі многіх лягероў, дзе знаходзіліся нашыя скаўцкія адзінкі.

Адначасна **пачалася арганізацыйная праца па-за межамі Нямеччыны.** Паўсталі новыя групы ў Францыі, Бэльгіі, Бразыліі. У стадыі арганізацыі знаходзяцца скаўты у Зл. Шт. Амэрыкі, Аўстраліі, Канадзе і Аргентыне. На перашкодзе арганізацыйнай дзейнасьці стаяць: расьцярушанасьць нашай эміграцыі, адсутнасьць матарыяльных сродкаў і розныя іншыя абставіны.

У Нямеччыне скаўцкая моладзь у мінулым годзе праводзіла хоць абмежаваную ,але пасьлядоўную выхаваўчую працу згодна з агульным выхаваўчым плянам. Сярэдняя і старэйшая скаўцкая моладзь брала актыўны ўдзел у розных курса хі навучальных установах, павышаючы свае веды і ўмеласьці.

Апрача гэтага было праведзена шмат самастойных скаўцкіх імпрэзаў у асяродках, дзе знаходзілася скаўцкая моладзь, агульны лік 50. Усіх скаўцкіх зборак было праведзена 356, уступіла ў ЗБСЧ 57 новых сяброў і сяброўак.

Не ўважаючы на цяжкія матарыяльныя ўмовы **Галоўная Кватэра змагла прычыніцца да росту скаўцкага руху, выдаючы цэлы рад брашур і скаўцкіх дапаможнікаў,** як Рэгуляміны і Статут ЗБСЧ, скаўцкі сьпеўнік, дапаможнік для кіраўнікоў скаўтаў і старэйшых скаўтаў, скаўцкія гульні і розны іншы інфармацыйны матарыял. Адначасна падрыхтаваны да друку матарыялы для дзяцей дашкольнага веку, падручнік для старэйшых скаўтаў і праваднікоў ваўчанятаў.

У сувязі з зьмененымі абставінамі **зьмяніліся формы і спосабы дзейнасьці скаўцкай моладзі па-за Нямеччынай.** Ва ўсіх краінах нашай моладзі даводзіцца ўжо самастойна праводзіць у жыцьцё нашыя скаўцкія і нацыянальныя ідэалы. Гэткую дзейнасьць праводзяць нашыя старэйшыя скаўты ў Бэльгіі, Англіі, Францыі, Зл.-Шт. Амэрыкі і Бразыліі. **Усюды старэйшая скаўцкая моладзь стаіць непахісна пры нацыянальных і скаўцкіх ідэалах** і гэтым дае падставу думаць, што наш скаўцкі рух перахавае на чужыне сваю ідэалёгію і перадасьць яе вызваленай Бацькаўшчыне.

Дзеля каардынацыі скаўцкай дзейнасьці ў розных краінах, 4-я Скаўцкая Канфэрэнцыя аднагалосна вызначыла ўпаўнаважаных на наступныя краіны: Аўстралію, Англію, Аргентыну, Бэльгію, Бразылію, Францыю, Канаду, ЗЛ.-Шт. Амэрыкі і Нямеччыну.

4-я Скаўцкая Канфэрэнцыя ЗБСЧ, што адбылася ў Розэнгайме становіць далейшы крок у разьвіцьці нашага скаўцкага руху.

У БНК

Чацьвёртая гадавіна БНК

26. 2. 1946 г. на зьезьдзе прадстаўнікоў беларусаў ад трох заходніх зонаў Нямеччыны ў Рэгензбургу паўстала цэнтральная беларуская арганізацыя — Беларускі (Крывіцкі) Цэнтральны Дапамаговы Камітэт. Перавыбары ўраду гэтага Камітэту адбыліся ў днях 24—25 красавіка 1948 году на зьезьдзе выбраных дэлегатаў ад беларускіх лягероў, групаў й арганізацыяў у Остэргофэне, на якім была вынесена пастанова аб зьмене назову на **Беларускі Нацыянальны Камітэт.**

На працягу сваёй чатырогрохгадовай дзейнасьці БНК годна рэпрэзэнтараў і бараніў беларусаў перад УНРРАўскімі, ІРОўскімі й Амэрыканскімі Вайсковымі ўладамі й увайшоў у цеснае супрацоўніцтва з усімі Цэнтральнымі Камітэтамі іншых народнаў у Заходняй Нямеччыне. БНК быў адным з закладчыкаў і зьвязаецца да сяньня сябрам Міжнацыянальнай Арганізацыі ДП і ўцекачоў, у якую ўваходзіць 15 народаў.

Шукаюць

Гулевіча Адама, яго сыноў і дачок-высланых з Гомеля; Шубіча Валодзю з Бельска.

Сям'ю Хахановічаў з Ваўчкоў з-пад Вільні, якая да 1949 году жыла ў ДП лягеры „Вільдфлекэн"-Нямеччына.

Санчук Марыю нар. 1925 з маткай, **Сінкевіч** Лоаніда з жонкай Сашай, Здунак Зофію і Макоўскую Зіну — шукае Янка Шымчык.

Любу Белаус з вёскі Марцінавічы, павет Гродзенскі, якая 12 ліпеня 1944 выехала ў Нямеччыну, шукае Мікалай Белаус.

Харытончыка Саўку з жонкай Ленай, дачкой Тамарай і сынам Алегам шукае родны брат Юрка.

Весткі слаць на адрыс Адміністрацыі „Б-на

Рэдагуе Рэдкалегія.